**ДЫНАЗАЎРЫ Ў БЯРОЗЕ**
Незвычайная выстава працуе да 7 красавіка
2



**ПАД ЗНАКАМ БЕЛАГА РАМОНКУ**
Івацэвіцкі фтызіятр — аб барацьбе з туберкулёзам
3, 15



**ЛЕТАПІС ДУХОЎНАСЦІ:**
праваслаўная архітэктура Пружаншчыны
13



Выдавец УП "Газета для вас"

Выдаецца са студзеня 1997 года на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — адзін раз на тыдзень

# ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС

ІВАЦЭВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН
(Брэсцкая вобласць)

НАШ САЙТ У ІНТЭРНЭЦЕ
http://gdv.of.by

ISSN 1992-755X

№ 11 (742) 19 сакавіка 2010 г., пятніца

Кошт свабодны (у розніцу)

# ДРАГІЧЫНСКАЯ ВЕНЕЦЫЯ

## Вёска Какорыца ў чаканні паводкі

**Мала засталося ў Еўропе такіх мясцінаў, як вёска Какорыца Драгічынскага раёна, размешчаная ля Спораўскага возера. Уся абкружаная балотамі, яна ўжо празвана журналістамі драгічынскай Венецыяй.**

Акрамя сваіх балотаў, Какорыца вядомая яшчэ тым, што ў гэтай вёсцы распаўсюджаны ўсяго два прозвішчы — Зіновіч і Пратасевіч. Канешне, ёсць і іншыя, але іх не набярэцца і з дзесятак. Мясцовая легенда расказвае, што ў гэтыя балоты яшчэ ў часы Кацярыны II выслалі за нейкую віну двух сялян — Зіновія і Праtaса. Надзвычай жыццяздольнымі, працавітымі былі гэтыя сяляне, бо здолелі і выжыць, і паселішча тут стварыць. Паводле легенды, менавіта з той пары павяліся ў Какорыцы моцныя духам і вельмі працавітыя людзі.

Легенда легендай, але і сапраўды, можна ўявіць, як усім гэтым Зіновічам і Пратасевічам даводзілася працаваць на працягу апошніх стагоддзяў. Кожны лапік зямлі тут даводзілася адваёўваць у балота, лесу.

**Павел ДАЙЛІД.**
**Драгічынскі раён.**
**(Заканчэнне на 14-й стар.)**



Павел ДАЙЛІД

**Міхаіл Зіновіч яшчэ трымае і каня, і карову, але на будучыню вёскі глядзіць песімістычна.**

Выполним наружную и внутреннюю отделку в г. Ивацевичи
Благоустройство
Кровля.
(лицензия)
Термошуба.
Тел. 8-029-791-86-93
8-(01645) 2-71-49
УНН 290485569
ЧПТУП "Манитоба"

Лиц. № 14450/0483987от 17.06.08 г.Пинским ГИК.
КРОВЛЯ НА ЛЮБОЙ ФАСОН
УНН 290099018
- Металлочерепица (широкая гамма цветов) и комплектующие
- Мягкая кровля "Шинглас";
- Профнастил в наличии и под заказ;
- Водосточные системы круглого и прямоугольного сечения;
- Ворота секционные "Алютех";
- Сайдинг, софит (подшивка крыш);
- Лист кровельный "Ондулин", "Ондура";
- Мансардные окна; окна ПВХ;
- Утеплитель "ISOVER"
- Шифер серый;
- Поликарбонад;
г. Пинск, ул. Рокосовского, 4 Б, (павильон № 19 "КРОВЛЯСТИЛЬ" с 9.00 до 18.00. Вых. — воскресенье.
Консультация и замер бесплатно.
Наличный и безналичный расчет.
Тел./факс 8-(0165) 33-68-54; VELCOM 8-029-635-35-64, 8-029-337-15-03, МТС 8-029-800-96-72, 8-029-823-04-54.

УНП 290486218
ДСП ЛАМИНИРОВАННАЯ EGGER Австрия
НОВАЯ ЦВЕТОВАЯ ГАММА
ОДНОТОННЫЕ УНИ-ДЕКОРЫ
ДРЕВЕСНЫЕ ДЕКОРЫ
ФАНТАЗИЙНЫЕ ДЕКОРЫ
МНОГООБРАЗИЕ ФАКТУР
ВЫСОЧАЙШЕЕ КАЧЕСТВО
ЭКОЛОГИЧЕСКИ ЧИСТЫЕ МАТЕРИАЛЫ
СКЛАДСКАЯ ПРОГРАММА (10мм; 18мм.)
УСЛУГИ РАСКРОЯ ОКЛЕЙКИ
Тел.: 8 (0163) 42 53 71
8 (029) 648 61 65
8 (029) 829 12 63
А ТАКЖЕ:
ДСП ЛАМИНИРОВАННАЯ ПРОИЗВОДСТВА РФ, РП (PFLEIDERER)
ПОСТФОРМИНГ, ФАСАДЫ (ПЛАСТИК, ПЛЕНКА)
ШИРОКИЙ СПЕКТР МЕБЕЛЬНОЙ ФУРНИТУРЫ
КРОМОЧНЫЕ МАТЕРИАЛЫ
ЧТУП "МЕБЕЛЬСЕРВИС плюс" г.Барановичи, ул.50 Лет ВЛКСМ д. 6г.

СПУТНИКОВЫЕ АНТЕННЫ
УСТАНОВКА.
НАСТРОЙКА.
8-029-106-00-60
8-029-783-53-64
ИП Таршис С. С. Свид. № 0179839 от 07.05. 2009 г. Слонимским РИК
УНН 590877810

УНП 290506538 № BY/112 04.12.009 01261 16.11.09. г. до 15.11.2014 г. ЧТУП "Куис и К"
г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 2 а (район гортопа)
СТО
- Шиномонтаж легковых авто, грузовых, с/х техники;
- правка дисков;
- ремонт подвески;
- аргонная сварка;
в наличии шины, диски, масла, аккумуляторы
Заключаем договор с юр. лицами.
VEL. 8-029-626-48-93, МТС 8-029-520-40-60.



УНН 290482807 ООО "Мего-Лидер М"
г. Ивацевичи, ул. Советская, 9
Мебель РБ
BRW
КОРПУСНАЯ МЕБЕЛЬ
• шкафы
• спальни
• детские
• комоды
• прихожие
РАССРОЧКА
Тел. 8-(01645) 2-08-00

# ОБЕЛИСК В ДЕРЕВНЕ

## — дань памяти солдатам и жертвам войны

**БЕРЕЗА. С помощью земляков известный на Брестчине художник Анатолий Желудко соорудил в родной деревне Соболи Березовского района памятник сельчанам, не вернувшимся с Великой Отечественной войны. На мемориальных плитах — имена двенадцати жителей села, павших при освобождении стран Европы, и имена местных жителей, погибших от рук карателей.**

К этому памятному знаку односельчане несут живые цветы независимо от времени года. Установили его в деревне не так давно. Идея увековечить память тех, кто не вернулся в родные места с боевых сражений, родилась у Анатолия Желудко. Он же разработал эскиз монумента. Воплотить в жизнь творческие замыслы помогли земляки. Здесь увековечены имена 20 односельчан, не вернувшихся с войны: 12 солдат и 8 мирных жителей. Где они похоронены, до сих пор неизвестно.

Могилу своих родственников и их шестерых детей, погибших от рук карателей, Ивану Желудко, отцу художника, не удалось найти до сих пор. За связь с партизанами немцы вывезли семью в неизвестном направлении и расстреляли.

Неутихающую боль оставила Великая Отечественная и в душе Василия Зинчука. Он тоже не знает, где могила его близких. Этот обелиск — возможность увековечить их память.

Памятник односельчанам, тем, кто ценой собственной жизни отстоял мирное небо, — не единственная творческая идея жителей села. Еще Соболи славятся собственным музеем крестьянского быта под открытым небом. Экспонаты для него односельчане собирали все вместе. К слову, 15 объектов Березовского района внесены в Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь. Наиболее значимые из них Черняковская Свято-Николаевская церковь 1725 г., руины кляштора картузианцев 17 века, Старопесковский усадебно-парковый комплекс 19 века, Сигневичский Римско-католический костел Святой Девы Марии 1795 года.

**Николай ДЕНИСИК.**

# Андрэй Макарэвіч

## наведаў Бярозаўскі раён

**БЯРОЗА. Вядомы расійскі рок-музыкант і тэлевядучы Андрэй Макарэвіч наведаў Бярозаўскі раён, адкуль паходзяць яго продкі па лініі бацькі Вадзіма Макарэвіча.**

Ён пагаварыў з мясцовымі жыхарамі, наведаў некалькі вёсак — Паўлавічы, Малеч, Першамайскую, станцыю "Бяроза-Картузская".

Як паведамляе газета "Рэспубліка", дзед Андрэя Макарэвіча — Рыгор Андрэевіч Макарэвіч — нарадзіўся ў Паўлавічах у 1886 годзе. Падчас Першай сусветнай вайны сям'я выехала ў Расію, у бежанства. Рыгор Макарэвіч жыў у Маскве, у яго нарадзіўся сын Вадзім (бацька Андрэя Макарэвіча), які стаў вядомым архітэктарам.

**"Еўрарадыё".**

# Калі ж навучымся?

**ПРУЖАНЫ. Даверлівасць нашых грамадзян не мае межаў. Гэтым ахвотна карыстаюцца розныя махляры.**

Так адбылося і з жыхаром горада, які 23 лютага паверыў незнаёмцу, які прапанаваў свае паслугі па перадачы сярэбранага ланцужка. Праз некалькі дзён пацярпелы звярнуўся ў міліцыю, дзе ўстанавілі, што каштоўнае ўпрыгожанне цяпер у руках раней судзімага, нідзе непрацуючага і без вызначанага месца жыхарства злачынцы. Узбуджана крымінальная справа, а ашуканец "у бягах".

А 25 лютага па дапамогу да міліцыянераў звярнуўся жыхар в. Вялікае Сяло, які стаў ахвярай мабільнага махляра. Невядомы папрасіў у яго "трубку", каб патэлефанаваць, і збег з мабільнікам. Аднак недалёка: хутка супрацоўнікі праваахоўных органаў устанавілі асобу "ўцекача". Ім аказаўся нідзе не працуючы жыхар в. Ялова. Узбуджана крымінальная справа.

**Васіль СНАПКО.**

# "Гукі вясны"

## — канцэрт у Брэсце

**БРЭСТ. 20 сакавіка ў 16.00 у Брэсцкім дыска-бары Zio Pepe адбудзецца музычны марафон "Гукі вясны" з удзелам найлепшых гуртоў і выканаўцаў вобласці.**




У праграме выступы такіх аўтарытэтаў беларускай музыкі, як :B:N: (Бяроза), Sciana (Брэст), PRANA (Брэст), Vinsent (Івацэвічы), Amerta (Брэст), The Fraiz (Брэст), Ushuaia (Брэст). Спецыяльны госць мерапрыемства — рок-гурт Спрат (Брэст).

Дарэчы, вядучым мерапрыемства, як плануецца, будзе Дзмітрый Папко з Івацэвічаў, які больш вядомы як рэпер Vinsent. У адным з бліжэйшых нумароў "Газеты для вас" мы падрыхтуем інтэрв'ю з гэтым таленавітым спеваком.

Арганізатары канцэрта абяцаюць, што першыя 200 чалавек атрымаюць у падарунак складанку ў фармаце mp3 з песнямі вядомых выканаўцаў нашай вобласці.

Падчас канцэрта будзе магчымасць удзельнічаць у конкурсах і выйграць прызы.

Кошт уваходнага білета — 10.000 рублёў.

**Павел ДАЙЛІД.**

# Памяти учителя

**БЕРЕЗА. Пятый областной турнир по спортивным играм памяти преподавателя физического воспитания Березовского лицея строителей Сергея Козлова прошел в начале марта в спортивном зале лицея.**

Сергей Васильевич Козлов был одним из лучших преподавателей-методистов Брестской области. За время своей работы учитель физвоспитания неоднократно награждался почетными грамотами всех уровней, включая Министерство образования Республики Беларусь. Его имя было занесено на Доску почета Брестского государственного университета им. А. С. Пушкина, он воспитал много спортсменов самой высокой квалификации. Перед началом соревнований прошли показательные выступления воспитанников клуба каратэ "Сатори". Соревновались команды-участники по волейболу и мини-футболу. Всего в турнире участвовали шесть команд, из них три из Березы, а также из Малориты, Белоозерска, Бреста. В результате победителем в соревнованиях по мини-футболу стала команда лицея строителей, а в волейболе победа досталась команде колледжа электротехников из Белоозерска.

**Николай ДЕНИСИК.**

# Дыназаўры ў Бярозе



Павел ДАЙЛІД.

**БЯРОЗА. Да сёмага красавіка працуе выстава дыназаўраў у галерэі мастацтваў Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.**

Гаспадары і стваральнікі гэтай непаўторнай для Беларусі выставы жыхары Бярозы Уладзімір і Тацццяна Найбічы. Наведвальнікі музея маюць унікальную магчымасць на свае вочы, а не па тэлевізары, пабачыць макеты гэтых дагістарычных жывёлін. Некаторыя з дыназаўраў выраблены ў натуральную велічыню. Як патлумачыў нам Уладзімір Найбіч, такога монстра, як тыраназаўр, у натуральную велічыню праблематычна вырабіць, таму што ягоны рост мог дасягаць вышыні трохпавярховага дома.

Акрамя дыназаўраў наведвальнікі ўбачаць тут і дзіўных насякомых, якія ўваходзілі ў экспазіцыю Найбічаў "Дагістарычныя насякомыя".

Старшы навуковы супрацоўнік музея Галіна Краўчук распавяла, што выстава карыстаецца досыць высокай папулярнасцю найперш сярод бярозаўскіх дзяцей.

Выставачным бізнесам Найбічы займаюцца ўжо 10 гадоў. Гэта ўжо другая выробленая імі за гэты час выстава дыназаўраў. Акрамя яе маюцца ў іх выставы "Экзатычныя насякомыя" і "Падводнае царства", якія зараз выстаўляюцца ў іншых гарадах.

**Павел ДАЙЛІД.**

# На летнее время

**На территории Беларуси 28 марта 2010 года в 2.00 стрелки часов будут переведены на один час вперед.**

В соответствии с порядком исчисления времени, определенным постановлением правительства от 13 мая 1996 года №317, на территории Беларуси 28 марта будет осуществлен переход на летнее время.

# Вогненны тыдзень на Пружаншчыне

**ПРУЖАНЫ. Мінулы тыдзень адразу пачаўся з пажара ў горадзе. Трывожны выклік паступіў з прыватнага дома: агонь разгуляўся з-за парушэнняў правілаў карыстання агнём. У выніку апёкі атрымалі гаспадары дома, жанчына шпіталізавана ў цяжкім стане. Пашкоджана ўнутраная аддзелка пакояў.**

Дзесятага сакавіка пажарныя ўтаймоўвалі агонь у вёсцы Лыскава. Пажар поўнасцю знішчыў дах жылога дома, пашкодзіў перакрыцці і сцены. Мяркуемая прычына здарэння — кароткае замыканне электраправодкі.

14 сакавіка ў раёне зарэгістраваны адразу два вогненныя здарэнні. Спачатку трывожны выклік паступіў з г. п. Шарашова. Пажар разгуляўся з-за неасцярожнасці пры курэнні ў вельмі нецвярозым стане гаспадара дома. Яго самога пажарным ледзь паспелі выратаваць з чаду. Агнём пашкоджана падлога, пасцельныя прыналежнасці.

Праз некаторы час давялося змагацца са стыхіяй у в. Юндзілы. Як мяркуецца, з-за парушэнняў правілаў карыстання пячным ацяпленнем ледзь поўнасцю не згарэў жылы дом і прыбудаваны да яго хлеў. Самі гаспадары атрымалі апёкі рознай ступені цяжкасці.

**Васіль СНАПКО.**

# Абрабавалі дзядулю

**ІВАЦЭВІЧЫ. 13 сакавіка ўначы ў Івацэвіцкі РАУС звярнулася пенсіянерка, 1936 года нараджэння, жыхарка в. Дабромысль.**

Жанчына заявіла, што каля гадзіны ночы двое невядомых, сарваўшы навясны замок, улезлі ў гараж у двары дома. Калі на шум выйшаў гаспадар — пенсіянер 1930 года нараджэння, то зладзеі яго збілі і адкрыта ўкралі 60 літраў бензіну на суму 204 тысячы рублёў.

Следча-аператыўнай групай было высветлена, што рабаўніцтва ўчыніў мясцовы жыхар, 1965 года нараджэння, які затрымаўся. Ягоны хаўруснік устанаўліваецца.

**Павел ДАЙЛІД.**

# П'яная трагедыя

**ПРУЖАНЫ. Раніцай 11 сакавіка падчас выканання работ па абслугоўванні малочна-таварнай фермы каля в. Смаляны ААТ "Айчына" ў гноепрыёмнай яме быў знойдзены труп мясцовага жывёлавода.**

Паводле папярэдніх даных экспертызы 52-гадовы мужчына загінуў з-за парушэнняў правілаў аховы працы і знаходзіўся ў высокай ступені ап'янення. Далейшае расследаванне праводзяць спецыялісты Бярозаўскай міжраённай інспекцыі працы.

**Вікенцій БАРТАСЕВІЧ, галоўны спецыяліст БМІП.**

# ПАД ЗНАКАМ БЕЛАГА РАМОНКУ

## 24 сакавіка — Сусветны дзень барацьбы з туберкулёзам

**Пра асаблівасці гэтай праблемы мы пагаварылі з раённым фтызіятрам установы аховы здароўя "Івацэвіцкая цэнтральная раённая бальніца" Наталляй Мікалаеўнай Пракопчык.**

**— Наталля Мікалаеўна, сусветная практыка паказвае, што магчыма вылечыць 92-95% захварэўшых туберкулёзам. А як з гэтай статыстыкай у нас?**

— Вылечыць да 95% захварэўшых магчыма пры своечасовым, раннім выяўленні захворвання. Аднак нізкая санітарная культура насельніцтва не заўсёды гэта дазваляе. Людзі часта адмаўляюцца ад медагляду, і хвароба перахodзіць у больш цяжкую стадыю. Калі казаць у працэнтах, то ў вобласці да 90% захварэўшых вылечваюцца.

За 2009 год у Івацэвіцкім раёне зарэгістравана 27 новых выпадкаў захворвання. Такая статыстыка трымаецца ўжо на працягу пяці гадоў. З гэтых захварэўшых пяць чалавек з групы сацыяльнай рызыкі. Трое з гэтых чалавек не праходзілі медагляд больш за два гады, адзін знаходзіўся на заробках у Расіі. Выяўлены туберкулёз быў таксама і ў чатырох работнікаў ферм і двух настаўнікаў.



Павел ДАЙЛІД.

Раённы фтызіятр установы аховы здароўя "Івацэвіцкая цэнтральная раённая бальніца" Наталля Мікалаеўна Пракопчык.

**Гутарыў Павел ДАЙЛІД.**
**г. Івацэвічы.**

**(Заканчэнне на 15-й стар.)**

# Смерць ветэрынара,

## альбо Ці толькі цыгарэта вінавата?

**Чуткі пра гібель мясцовага маладога ветэрынара мясцовага СВК абляцелі вёску Хадакі імгненна, нягледзячы на вячэрні час. Цела 25-гадовага хлопца без усялякіх прыкмет жыцця знайшлі на падлозе каля дзвярэй жылога пакоя яго кватэры ў двухкватэрным катэджы. Кватэру ён нядаўна атрымаў. Суседзяў пакуль у яго не было. Па словах вяскоўцаў, малады ветэрынар збіраўся жаніцца. Яго знайшлі толькі праз два дні пасля смерці, калі занепакоіліся аб адсутнасці на рабоце два дні запар.**

У ролі забойцы ў чарговы раз выступіла цыгарэта, прыпаленая ў ложку. Аб гэтым яскрава сведчаць прапаленыя пасцельныя рэчы і моцны, едкі пах гары. Хаця найперш вінаваты сам загінуўшы, яго легкадумства, неабачлівасць, неахайнасць пры курэнні. Мяркуючы па абставінах, хлопец, адчуўшы пах дыму, спрабаваў выбрацца самастойна, але, паўзучы па падлозе, не здолеў адчыніць дзверы, якія адчыняліся ўнутр пакоя: ён так і застаўся ляжаць, упершыся ў дзверы галавою.

З пачатку года гэта ўжо другая ахвяра неасцярожнасці пры курэнні. Тым большае гора, што жыццё на цыгарэту перад сном прамяняў зусім яшчэ малады чалавек, перад якім жыццё толькі раскрылася ў сваёй поўнай прыгажосці. У рабоце ён быў бездакорны, асаблівых заўваг не меў, адначаюць нават яго адказнасць да даручанай справы. Хоць адно "але" ўсё ж было.

Аб прысутнасці ў арганізме загінуўшага алкаголю будзе дакладна вядома пасля заключэння судмедэкспертаў. Пакуль жа і ў гаспадарцы, і ў вёсцы не выключаюць такую верагоднасць, бо неаднаразова рабілі хлопцу заўвагі наконт спіртнога, ушчувалі, папярэджвалі. Але зберагчы ўсё ж не змаглі.

**Валерый МОЛАШ,**
**ст. інспектар прапаганды і навучання Івацэвіцкага райаддзела па НС.**

# Дни польской культуры

## проходят в библиотеке г. Березы

**Беларусь и Польшу связывают многовековые традиции добрососедских отношений, особенно это касается духовных, культурных, дружеских контактов. Порой трудно найти грань, разделяющую белорусский и польский народы. Стоит вспомнить А. Мицкевича и Э. Ожешко, М. Огинского и С. Монюшко, творчество которых является неоценимым богатством как польской, так и белорусской истории и культуры.**

Огромную работу по сохранению и развитию традиций белорусского фольклора, обычаев, архитектуры проводит Белорусское общественно-культурное товарищество, расположенное в Белостоке. Это по его инициативе проводится ежегодный Фестиваль белорусской песни в Белостоке, в котором участвуют сотни исполнителей из всей Польши. Не меньшей популярностью пользуется "Беларускае Купалле". Белорусскую молодежь из всей Польши собирает фестиваль современной молодежной музыки "Басовішча". Трудно представить себе какой-либо праздник на Белосточчине без участия белорусских фольклорных коллективов.

Дни польской культуры впервые проходят в Березовской центральной районной библиотеке с 18 по 21 марта. В рамках Дней культуры жители смогут увидеть художественные фильмы польских режиссеров, среди которых корифей польского кино Роман Полански. Учащиеся курсов польского языка под руководством Елены Устиловской познакомят всех желающих с коллекцией польских монет. Для любителей классической музыки состоится вечер, посвященный 200-летию со дня рождения Шопена "Сонет Шопена". Учащиеся школ города смогут совершить виртуальное путешествие по Польше. В течение всех этих дней будут звучать стихи польских поэтов.

**Николай ДЕНИСИК.**
**г. Береза.**

# Весенний лед коварен

**Весенний лед особенно опасен для тех, кто живет вблизи реки, озера или другого водоема. Дело в том, что привыкнув зимой пользоваться тропинками и переходами по льду, многие забывают об опасности, которую таит в себе лед весной.**

Больше всего несчастных случаев происходит весной с детьми. В прошедшем 2009 году провалились под лед и утонули четверо малолетних детей. Особенно недопустимы игры детей на льду в период вскрытия рек. В восторге дети прыгают на льдины, перескакивая с одной на другую, и все дальше удаляются от берега. Такие случаи, как правило, заканчиваются трагически. Вот почему весной, особенно в период вскрытия рек и ледохода, необходимо усилить наблюдение за детьми, не допускать их шалостей у воды, вести среди них разъяснительную работу. Этим должны заниматься и родители, и учителя.

Помните, весенний лед не прочен, коварен, а потому особенно опасен!

**Любовь ПИЩИК,**
**председатель Ивацевичской районной организации ОСВОД.**

# Чым павінны заняцца дэпутаты новага склікання?

## Адказваюць жыхары г. Пружаны і раёна



**НІНА КАНСТАНЦІНАЎНА:** Я пайду на выбары, бо заўсёды хаджу. Хочацца, каб новыя дэпутаты паспрыялі таму, каб у нас, у вёсцы Воля, асфальт нарэшце паклалі.



**СЯРГЕЙ:** Трэба, каб дэпутаты больш займаліся праблемамі добраўпарадкавання. Варта больш ім займацца і прыцягненнем турыстаў у наш раён.



**ГАЛІНА:** Хай яны не абяцаюць таго, чаго зрабіць не могуць. Трэба, каб у іхняй рабоце было меней словаў, а болей справы. Ну і трэба дэпутатам бліжэй да народу быць.



**АЛЯКСЕЙ:** Трэба, каб новыя дэпутаты думалі над тым, каб паболей будавалася ў нашым горадзе жылля і каб яно было больш даступным для маладых людзей.



**ВІКТАР:** Няма ў мяне ад іх ніякіх чаканняў, бо яны простым народам не займаюцца. Нічога значнага дэпутаты не вырашаюць, дык навошта іх выбіраць?

**У народ хадзіў Павел ДАЙЛІД (фота аўтара).**

# ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ

## Саюзнай дзяржавы ў Брэсце

**У Брэсце адбылося пасяджэнне Савета міністраў Саюзнай дзяржавы (СД) у пашыраным складзе. Перамовам папярэднічала сустрэча прэм'ер-міністраў Сяргея Сідорскага і Уладзіміра Пуціна ў вузкім фармаце.**



На парадку дня пасяджэння саюзнага Саўміна было больш за 20 пытанняў. У прыватнасці, бакі абмеркавалі выкананне сумеснага міжурадавага плана па мінімізацыі наступстваў фінансавага крызісу, праграму супрацоўніцтва ў паліўна-энергетычным комплексе (ПЭК) і прагнозныя балансы паліўна-энергетычных рэсурсаў СД на 2010 год.

Нагадаем, 4 сакавіка намеснік дзяржсакратара СД Васіль Хрол заявіў журналістам, што праграма беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў ПЭК пакуль не да канца ўзгоднена і разглядаць яе на пасяджэнні саюзнага ўрада ў Брэсце рана.

Папярэдняе пасяджэнне Саўміна СД адбылося 28 кастрычніка 2009 года ў Маскве.

●

У першым квартале гэтага года Расія пастаўляла Беларусі газ па цане 169 долараў за тысячу кубаметраў, паведаміў прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін пасля заканчэння пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы.

Паводле яго слоў, Расія працягвае падтрымліваць беларускую эканоміку за кошт танных энергарэсурсаў. Напрыклад, Украіна, адзначыў Пуцін, атрымлівае газ па 304 долары. "І калі параўнаць з сярэднееўрапейскай цаной, то выйгрыш Беларусі складае 2 млрд. 600 млн. долараў. Плюс Расія пастаўляе 6,3 млн. тон нафты бяспошлінна. Гэта яшчэ 1 млрд. 600 млн. долараў", — сказаў прэм'ер-міністр.

Пуцін паведаміў, што бакі ўзгаднілі баланс паліўна-энергетычных рэсурсаў на 2010 год. "Гэты дакумент падпісаны, і з гэтага будзем зыходзіць (падчас паставак энергарэсурсаў)", — сказаў ён.

Паводле слоў Пуціна, з пачаткам функцыянавання 1 студзеня 2012 года адзінай эканамічнай прасторы "мы павінны адысці ад збірання ўсялякіх пошлін на прадукцыю, якая пастаўляецца".

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі заявіў, што падчас абмеркавання пытанняў паставак энергарэсурсаў беларускі бок унёс свае прапановы адносна працы расійскіх нафтавых кампаній на рынку краіны і давальніцкай перапрацоўкі нафты.

●

План сумесных дзеянняў Беларусі і Расіі па мінімізацыі наступстваў сусветнага фінансавага крызісу дае свае вынікі, заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін 16 сакавіка ў Брэсце на пасяджэнні Савета міністраў Саюзнай дзяржавы.

Паводле яго слоў, у студзені гэтага года беларускі экспарт у Расію вырас на 17% у параўнанні са студзенем 2009 года.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што Беларусь і Расія рыхтуюцца перайсці да наступнага этапа інтэграцыі: стварэння адзінай эканамічнай прасторы. Пуцін падкрэсліў, што абедзве краіны многае зрабілі на шляху інтэграцыі. Разам з тым, паводле яго слоў, некаторыя пытанні гарманізацыі заканадаўства засталіся на паперы.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі адзначыў, што Саюзная дзяржава з'яўляецца "найбольш стабільным, дынамічным і перадавым інтэграцыйным утварэннем на тэрыторыі СНД". "Наша праца адпавядае надзеям людзей, якія жывуць і працуюць у Саюзнай дзяржаве", — заявіў кіраўнік беларускага ўрада.

●

"Увядзенне адзінай валюты стымулявала б работу суб'ектаў эканамічнай дзейнасці, спрасціла ўзаемныя разлікі і мінімізавала расходы суб'ектаў гаспадарання, а значыць, павысіла б іх канкурэнтаздольнасць". Такую заяву зрабіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін 16 сакавіка ў Брэсце на прэс-канферэнцыі пасля заканчэння пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы.

Гаворачы аб эканамічным узаемадзеянні Беларусі і Расіі, Пуцін падкрэсліў, што на пасяджэнні саюзнага Саўміна беларускі бок унёс шэраг прапаноў па развіцці кааперацыі. "Мы разлічваем, што гэтыя праекты будуць рэалізоўвацца", — сказаў Пуцін. Ён адзначыў, што ўзровень кааперацыі прадпрыемстваў двух краін "і так вельмі высокі". Па некаторых прадпрыемствах ён складае 70—80%.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што першыя крокі па стварэнні адзінай мытнай прасторы выклікалі рэзкае павелічэнне паставак беларускай прадукцыі на расійскі рынак.

Кіраўнік беларускага ўрада Сяргей Сідорскі таксама адзначыў, што развіццё кааперацыі дазволіць "прырасці беларускай прадукцыі на расійскім рынку".

**БелаПАН.**

# Адным сказам

● Увечары 15 сакавіка пры наглядзе памежнікамі на чыгуначным вакзале ў Брэсце пасажырскага цягніка, які накіроўваўся з Варшавы ў Маскву, у адным з вагонаў было знойдзена паўтара кілаграма какаіну.

● Удзельнікаў акцыі салідарнасці, якая прайшла 16 сакавіка на Кастрычніцкай плошчы Мінска, адпусцілі без складання пратаколаў.

● 16 сакавіка РУП "Белтэлекам" пашырыла знешні інтэрнэт-шлюз Беларусі ў заходнім кірунку на 2 Гбіт/с.

● За два гады абмежаванняў па найме работнікаў сектар індывідуальнага прадпрымальніцтва (ІП) страціў амаль 65 тысяч працоўных месцаў, а дзяржава недалічылася падатковых паступленняў, заявіў старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Перспектыва" Анатоль Шумчанка.

● Туркменістан разлічвае на дапамогу Беларусі ў стварэнні сістэмы ваеннай адукацыі.

● З 20 па 30 сакавіка ў рамках рэспубліканскай дэкады "Дзяржтэхагляд" будзе ўзмоцнены кантроль на вуліцах і дарогах Беларусі.

● Камісія па найменаванні і перанайменаванні вуліц, праспектаў, плошчаў і іншых частак горада Мінска прапанавала вярнуць станцыі метрапалітэна "Плошча Леніна" ранейшую назву — "Плошча Незалежнасці".

● Украіна пакуль не збіраецца ўступаць у Мытны саюз Беларусі, Казахстана і Расіі, заявіў віцэ-прэм'ер Украіны Сяргей Цігіпка.

● Цэны на харчовыя тавары ў лютым 2010 года ў адносінах да студзеня 2010 года выраслі на 0,9%, да лютага 2009 года — на 6,4%, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт.

# Кандыдаты ў дэпутаты — дастойныя

**У Брэсцкай вобласці рух "За Свабоду" вылучыў дзевяць кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў. Дакументы на рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты пададзены з 12 па 15 сакавіка, паведаміў каардынатар руху па Брэсцкай вобласці Дзмітрый Траццяк.**

Паводле яго слоў, па адным прадстаўніку руху "За Свабоду" будуць балатавацца ў Пінскі, Баранавіцкі, Белаазёрскі гарадскія саветы, а таксама Маларыцкі, Камянецкі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Бярозаўскі, Пружанскі раённыя саветы. Акрамя таго, два — адначасова ў Брэсцкі абласны савет, адзін чалавек — у Бярозаўскі раённы савет і Малецкі сельсавет.

"Пры вылучэнні кандыдатаў кіраўніцтва руху зрабіла ўпор на якасць, а не на колькасць. Усе нашы кандыдаты — вядомыя і аўтарытэтныя людзі ў сваіх рэгіёнах, — адзначыў Траццяк. — Напрыклад, у Ганцавічах — гэта рэдактар незалежнай газеты "Ганцавіцкі час" Пётр Гузаеўскі, у вёсцы Малеч — Анатоль Сахаруша, які працаваў многія гады ў сельскай гаспадарцы Бярозаўскага раёна".

Як падкрэсліў Траццяк, усе дзевяць вылучаных рухам кандыдатаў маюць "дастаткова вопыту і ведаў, каб стаць дэпутатамі".

"Хаця фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій выклікае сумненні ў сумленнасці правядзення выбараў. Напрыклад, з 13 прадстаўнікоў нашага руху ў такія выбаркамы ўключаны толькі трое", — заявіў Траццяк.

**Ларыса ШЫГАНАВА.**

# Судзяць ваўкавыскіх прадпрымальнікаў

**Ваўкавыскія прадпрымальнікі Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка не прызнаюць выстаўленых ім абвінавачанняў. Пра гэта яны заявілі ў Вярхоўным судзе Беларусі, дзе 16 сакавіка атрымаў працяг разгляд іх справы.**

Падсуднымі па справе з'яўляюцца чатыры чалавекі: Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын і Міхаіл Казлоў. Першых трох абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да двух чыноўнікаў — намесніка міністра па падатках і зборах Беларусі Васіля Камянко і былога губернатара Гродзенскай вобласці Уладзіміра Саўчанкі.

Аўтуховіч і Асіпенка таксама абвінавачваюцца ў арганізацыі падпалу дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС Віталя Кацубы ў 2004 годзе.

Як заявіў у судзе прадстаўнік абвінавачвання пракурор Эльдар Сафараў, Ларын паводле ўказання Аўтуховіча і Асіпенкі набыў агнястрэльную зброю, электрашокеры, traтылавыя шашкі і радыёцацкі, дэталі якіх планавалася выкарыстоўваць для стварэння выбуховага прыстасавання.

Міхаіл Казлоў, падпалкоўнік міліцыі, былы кіраўнік УБАЗ па Гродзенскай вобласці, абвінавачваецца ў тым, што ведаў пра планы падрыхтоўкі тэрарыстычнага акта, але не зрабіў захадаў для яго прадухілення.

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch прызнала арышт прадпрымальнікаў палітычна матываваным.

**Сяргей ПУЛЬША.**

Уга ЧАВЕС:

# "Венесуэла будзе пастаўляць у Беларусь 4,2 млн. тон нафты ў год"

**Венесуэла будзе пастаўляць у Беларусь 80 тысяч барэляў нафты ў дзень. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес у часе візіту прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі за акіян. Не для ўнутрыбеларускіх патрэб, якія забяспечваюцца бязмытнай нафтай з Расіі. Пасля перапрацоўкі гэтую нафту плануецца прадаваць у Еўропе. Пастаўкі маюць распачацца ў маі.**

Аб'ёмы ўражваюць: гэта амаль 4,2 мільёна тон нафты за год. Нагадаем, што ўласныя патрэбы Беларусі складаюць каля 6 млн. тон, а ўласнабеларуская здабыча склала ў 2009 годзе ўсяго 1,7 млн. т. Мінулагодні абсягі экспарту з Расіі перавышалі 21 млн. т за год. Цяпер іх удасца знізіць.

Супольнае беларуска-венесуэльскае прадпрыемства "Петралера БелаВенесуэлана" сёння здабывае каля 1 млн. т нафты ў год. "Мы будзем і далей развіваць здабычу нафты ў інтарэсах абедзвюх краін", — дадаў А. Лукашэнка.

Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаваў дамовіліся пра тое, што беларусы будуць весці газіфікацыю венесуэльскіх гарадоў і пасёлкаў. "За найбліжэйшы год мы пабудуем у Венесуэле 3-4 заводы па вытворчасці трактароў, аўтамабіляў, вялікагрузных аўтамабіляў, буйны цагельны завод, разлічаны на выпуск 100 тыс. тонаў умоўнай цэглы", — сказаў беларускі кіраўнік.

Цана будучай нафты пакуль не агалошваецца.

Венесуэла пастаўляе нафту па льготных цэнах на Кубу, у Нікарагуа і іншым, драбнейшым саюзнікам, а таксама нават асобным "братэрскім" гарадкам у Штатах. Гэтыя пастаўкі маюць палітычную падбіўку. Чавэс фінансуе краіны, якія падтрымліваюць яго ў барацьбе за ўплыў на сусветнай арэне, пераважна супраць ЗША. Аднак сама Венесуэла знаходзіцца ў даволі сумным эканамічным становішчы. Гэтак, сёлета краіна пакутавала ад дэфіцыту электраэнергіі. Відавочна, што пастаўкі нафты з Венесуэлы за свет, у далёкую Еўропу, будуць залежаць ад палітычнага лёсу Чавэса.

Дагэтуль найбліжэйшым і найбольшым рынкам для нафты з берагоў Арынока былі ЗША.

**Сяргей ГЕЗГАЛА, "НН".**

# ЛЕТАПІС ДУХОЎНАСЦІ:

## праваслаўная архітэктура Пружаншчыны

**Архітэктура — летапіс гісторыі народа ў дрэве і камені. Гарадскія ансамблі, старажытныя замкі, ратушы і храмы, народнае жыллё ў сваіх лепшых прыкладах адлюстроўваюць талент народа, стварыўшага іх.**



Ружаны. Петрапаўлаўская царква.

Адной з самых даўніх на Пружаншчыне з'уляецца ружанская Петрапаўлаўская царква. Часам яе збудавання лічыцца 1675 г., хаця раней на яе месцы знаходзіўся драўляны храм, вядомы з 1568 г.. Менавіта гэтым годам датуецца запіс аб перадачы Васілём Тышкевічам царкве Пятра і Паўла адной валокі зямлі ў в. Байкі. Мураваны будынак узводзілі як уніяцкі і належаў ён базыльянам, хаця дакладны час перадачы гэтаму ордэну царквы ў Ружанах застаецца невядомым. У храмавых дакументах, апублікаваных пад 1867 г. у Археаграфічным зборніку, так і гаворыцца: "Нет известий, когда конвент наш базилианский был основан".

Але падчас XVII — XVIII ст.ст. шматлікія войны прывялі да поўнага заняпаду гэтай царквы. Толькі ў 60-я г.г. XVIII ст. Крысціна Масальская-Сапега — уладальніца Ружан — выдзеліла сродкі на аднаўленне храма, а ў 1784 – 1788 г.г. прыдворны сапежынскі архітэктар Ян Самуэль Бекер правёў яшчэ адну рэканструкцыю. Перабудовы змянілі толькі знешняе аблічча будынка, што набыў рысы барока, а першапачатковая планіроўка захавалася.

У 1834 г. базыльянскі ордэн быў закрыты, а ў 1839 г. адбыўся Полацкі царкоўны сабор, пасля якога уніяты былі далучаны да рускай праваслаўнай царквы. З таго часу Петрапаўлаўская царква адкрылася ўжо для праваслаўных вернікаў. Урад Ра-сійскай імперыі разглядаў царкву як адзін з асноўных сродкаў ўздзеяння на мясцовае насельніцтва з мэтай русіфікацыі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў пісаў так: "Возвращение из унии к православию древнерусского здешнего населения было одним из главнейших средств, способствовавших удержанию за Россиею возвращённых от Польши наших провинций". Землі і прыгонныя сяляне (56 душ), што належалі дадзенаму храму, адышлі на карысць дзяржавы.

Раней на гэтай царкве змяшчаліся драўляныя скульптуры ў рост чалавека — Святых Пятра, Паўла і Маісея, але ў сярэдзіне XIX ст. яны былі зняты.

Унутраная прастора храма таксама была ўпрыгожана драўлянымі выявамі анёлаў з крыжамі і кветкамі, якія былі вынесены з храма ў 50-я г.г. XIX ст. Справа ў тым, што каноны праваслаўнай царквы забараняюць ужываць у аздабленні цэрквау скульптуру, а уніяцкай — дазваляюць.

У 1875 г. царкву сур'ёзна пашкодзіў пажар — засталіся толькі сцены і частка даху са столлю над алтаром. Пасля рамонту 1878 г. Петрапаўлаўская царква набыла сучасны выгляд.

Адзінае кампазіцыйнае цэлае з царквой складаў манастыр, узведзены ў 1784 — 1788 г.г. з цэглы з яе правага боку. Усімі работамі па яго стварэнні кіраваў яго ўзгаданы Я. С. Бекер. Грошы ж былі ахвяраваны Аляксандрам Сапегам. Цяпер у былым манастыры базыльянаў знаходзіцца раённая турыстычная база.

На ўскраіне в. Круглае ў 1834 г. (дата выбіта на камені) была пабудавана Прачысценская царква. Гэта адзіны помнік стылю ампір на Пружаншчыне. Да паўстання 1863 – 1864 г.г. гэты храм належаў католікам. Ён быў пабудаваны на сродкі мясцовага шляхціца Яна Каніёвы Крашэўскага як усыпальніца роду. Раней царква і званіца каля яе ўваходзілі ў сядзібны комплекс Стары Куплін. Храм быў закрыты і моцна разбураны ў пасляваенныя гады.

Цікавая гісторыя Пакроўскай царквы ў в. Гарадзечна. Летам 1812 г. Расія падверглася ваеннаму нашэсцю напалеонаўскай арміі. 3-я руская армія генерала А. Тармасава адступала на ўсход. Былі пакінуты Пружаны. Каля в. Гарадзечна ва ўрочышчы Высокая Гара 30 — 31 ліпеня 1812 г. адбылася жорсткая бітва паміж арміяй А. Тармасава (18 тыс. чал.) і аўстрыйска-саксонскім корпусам князя К. Шварцэнберга і графа Ж. Л. Рэнье (38 тыс. чал.). Перамога не дасталася нікому, але рускія адступілі на Валынь. Пасля заканчэння вайны неадназначныя выказваліся думкі, каб увекавечыць памяць загінуўшых у гэтых мясцінах. Пры сустрэчы і ў перапісцы з гродзенскім губернатарам А. Тармасаў некалькі разоў выказваў такія пажаданні, і яго заклікі былі пачуты. Арганізатарам будаўніцтва прызначылі мясцовага шляхціца Шэмета, а фундатарам выступіў граф Войцах Пуслоўскі. Помнікам героям 1812 г. стала Пакроўская царква, пабудаваная ў 1825 г. Арыгінальнасць гэтаму храму надалі прыгожыя калоны, дзве на ўваходзе і дзесяць унутры, што сімвалізавалі "Двенадцатый памятный год".

Пакроўская царква была рэстаўрыравана ў канцы 80 — пачатку 90-х г.г. XX ст.

Было пабудавана яшчэ некалькі помнікаў у гонар Гарадзечненскай бітвы — помнік-капліца "Доблестным предкам, погибшим в битве под Городечно 1812 года 31 июля", дзве брацкія магілы, стэла на 22-м км шашы Пружаны — Высокае каля в. Паддубна (усталявана ў 1962 г. да 150-годдзя бітвы). Помнік-капліца была закладзена ў 1912 г. і адкрыта ў 1914 г. На яе сценах былі высечаны назвы воінскіх часцей, што ўдзельнічалі ў Гарадзечненскай бітве, і імёны загінуўшых. У часы І-й сусветнай вайны каля яе былі таксама пахаваны рускія салдаты. Капліца была разбурана ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адноўлена ў 1999 г.



Гарадзечна. Помнік-капліца.



Круглае. Прачысценская царква.

У 1857 г. пачалося будаўніцтва мураванага касцёла ў Пружанах па праекце архітэктара Г. Марконі пад апякунствам местачковага шляхціца Валенція Швыкоўскага. Аднак гэту справу да канца завяршыць не ўдалося. У сувязі з падзеямі паўстання 1863 г. работы былі прыпынены, а ў 1864 г. па рашэнні царскай адміністрацыі недабудаваны храм быў перададзены праваслаўнаму ведамству. Такім чынам, завяршалі будоўлю ўжо на сродкі праваслаўных. Так у павятовым цэнтры з'явілася новая царква, што была асвячона як Прачысценская.

Вялікая Айчынная вайна прынесла храму толькі разбурэнне і пажар. У канцы 40-х г.г. XX ст. будынак быў канчаткова знішчаны. Зараз на яго месцы стаіць гарадскі універмаг.

Як ужо ўзгадвалася, асноўная роля ў русіфікацыі краю адводзілася праваслаўнай царкве. На падтрымку царквы царызм накіроўваў 10% ад кошту ўсёй канфіскаванай маёмасці ўдзельнікаў паўстання 1863 — 1864 г.г. Ва ўсіх губернскіх і павятовых гарадах Паўночна-Заходняга краю былі створаны камітэты па будаўніцтву праваслаўных цэркваў. У 1865 г. узнік Часовы Пружанскі камітэт для ўздыму і ўсталявання праваслаўнай царквы на чале з кіраўніком горада і павета капітанам Элісам. На сходзе сельскіх прадстаўнікоў Пружанскага павета было вырашана будаваць праваслаўны сабор. Гэтае будаўніцтва разглядалася імі як праява вернасці і ўдзячнасці цару Аляксандру ІІ, які 19 лютага 1861 г. адмяніў прыгоннае права і 1 сакавіка 1863 г. скасаваў паншчыну і дазволіў сялянам выкупляць зямлю. Таму новую царкву сталі будаваць у гонар Святога Аляксандра Неўскага — заступніка Расіі і "храніцеля яго Імператарскай Вялікасці". Цэгла на будаўніцтва храма бясплатна паступала з канфіскаванага ў В. Швыкоўскага цагельнага завода ў Палянова і недабудаванага касцёла. Урад накіраваў на будаўніцтва сабора 26 тыс. рублёў. Сродкі на будоўлю збіраліся ў многіх гарадах імперыі — Санкт-Пецярбургу, Ніжнім Ноўгарадзе, Адэсе і інш. Кожны сялянскі двор Пружанскага павета абавязаны быў здаць па 50 капеек і адправіць мужчыну на адзін дзень на будаўніцтва храма.

З завода пецярбургскага купца Пікіева ў Пружаны прывезлі 9 званоў, маскоўскае купецтва падаравала рызніцу, свяшчэнны посуд, кнігі для богаслужэння і многае з царкоўнага начыння. Адкрыццё сабора Аляксандра Неўскага адбылося 20 кастрычніка 1866 г.

Архітэктура храма ўвасобіла ў сабе прыёмы і формы класіцызму.

У пружанскім саборы зараз знаходзіцца старажытная ікона тыпу "Распяцце" — "Пружанская Галгофа" ("Багародзіца, якая плача"), якая лічыцца цудадзейнай. У 1934 г. з абразом адбыўся цуд: з вачэй Богамаці сталі выцякаць слёзы. Штогод з таго часу 9 красавіка і ў пятніцу Вялікоднага тыдня вернікі адзначаюць свята ў гонар гэтай іконы.

У 1872 г. з цэглы была пабудавана ў папулярным на тыя часы псеўдарускім стылі Мікалаеўская царква ў Шарашове.

Прыкладам мясцовай трактоўкі культавай пабудовы з'яўляецца царква Аляксандра Неўскага ў в. Блізная. Яна зроблена з бутавага каменю і цэглы ў 1888 г. на вясковых могілках.

На Пружаншчыне захавалася некалькі помнікаў драўлянай культавай архітэктуры, якія адносяцца да XVIII — XIX ст.ст. Найбольш значны сярод іх — званіца ў Шарашове (1799 г.), якая была пабудавана без адзінага цвіка каля драўлянай Прачысценскай царквы (1760 г.).

Званіца — помнік рэспубліканскага значэння, пабудаваны ў стылі класіцызму. З 1990 г. яна знаходзіцца на кансервацыі.

Адным з цікавейшых помнікаў драўлянага дойлідства з'яўляецца Мікалаеўская царква ў в. Вяжное, створаная ў 1781 г. (па іншых крыніцах — у 1799 г.). Яна спалучае ў сабе элементы традыцыйнай народнай архітэктуры і стылю класіцызм. На амвоне гэтага храма з левага боку ёсць след ад снарада, які трапіў сюды ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Да 2005 г. на царкоўным двары была брацкая магіла 13-ці савецкіх воінаў, якія вялі тут няроўны бой з акупантамі (перазахаваны на могілках у в. Слабудка). Царква дзейнічае да нашага часу.

Помнікам пачатку XIX ст. з'яўляецца драўляная царква ў в. Ялова. Царква пабудавана на могілках з сасновага брусу. Раней храм быў упрыгожаны драўлянай скульптурай (першапачаткова быў уніяцкім).

Захаваўся таксама помнік народнага драўлянага дойлідства ў паўднёвай частцы мястэчка Шарашова (на могілках) — Петрапаўлаўская царква (1824 г.).

У цэнтры в. Лыскава ў 1933 г. з сасновага брусу была пабудавана царква Ражаства Багародзіцы, якая з'яўляецца помнікам народнага драўлянага дойлідства (праект беластоцкага архітэктара Піятроўскага). Дадзены храм мае адзін прастол, па баках ад алтара — невялікія рызніцы, іканастасы перанесены з царквы, якая дзейнічала ў канцы XIX — пачатку XX ст.ст. у сценах былога Троіцкага касцёла, які ў польскія часы вярнулі католікам.

Наогул, на тэрыторыі Пружаншчыны захавалася больш чым 20 помнікаў культавай архітэктуры. Многія з тых храмаў, што былі разбураны, аднаўляюцца, узводзяцца новыя. Узведзены — Петрапаўлаўская царква ў в. Мокрае, царква ў гонар Казанскай іконы Божай маці ў в. Мурава, смаляніцкая царква ў гонар Мікалая Цудатворцы, Мікалаеўская царква ў Пружанах і інш.

**Наталля ПРАКАПОВІЧ.**
**г. Пружаны.**

# ДРАГІЧЫНСКАЯ ВЕНЕЦЫЯ

## Вёска Какорыца ў чаканні паводкі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У цяжкіх умовах жыхары Какорыцы змагаліся за свой хлеб не толькі з прыродай, але нават і з уладамі. Калі пачалася прымусовая калектывізацыя, вяскоўцы, даведаўшыся, што бальшавікі будуць забіраць у калгас збожжа, арганізавалі нешта накшталт вясковай самаабароны. Калі прыехала дэлегацыя з райцэнтра арганізоўваць тут калгас, то дыялогу з какорынцамі ў чыноўнікаў не атрымалася. У запале людзі нават перавярнулі машыну, на якой прыехалі да іх няпрошаныя госці. Пасля гэтага 12 вяскоўцаў пасадзілі на 10 гадоў, а калгас усё ж арганізавалі. А зараз мясцовыя кажуць, што ўжо можна лічыць, што калгаса тут няма, бо няма калгаснікаў, усе ж пенсіянеры.



Марыя Зіновіч сумяшчае працу бібліятэкара і прадаўца.



Іван Зіновіч кажа, што яму ўжо цяжка нарыхтоўваць сена для каня.

Ад Какорыцы да Бездзежа вядзе вельмі разбітая грунтовая дарога. Раней яе зусім не было, і галоўным транспартам тут была лодка. Яшчэ нядаўна па вясковых каналах, як у Венецыі, плавалі лодкі. І сёння ўвесну гэтыя каналы разліваюцца, але ўжо не так, як раней, дзякуючы чарговай меліярацыі, што праводзілася пару год таму.

Сёння ў вёсцы пражывае каля паўтары сотні чалавек. Школа ўжо закрытая, а восем вясковых дзяцей возіць аўтобус у Бездзеж. Дарэчы, у дзень нашага наведвання вёскі школьны аўтобус чамусьці ў вызначаны час не прыйшоў. Таму адна з чакаўшых яго жанчын пайшла пехатою ў Бездзеж за сваім дзіцём.

— Мала ўжо і кароў трымаюць у нас, сена ж калгас не дае, а старым яго нарыхтоўваць цяжка. Маладых у вёсцы ўжо зусім мала, — расказаў Іван Зіновіч, які ехаў на кані з Бездзежа.

Не мае аптымізму наконт будучыні вёскі і пенсіянер Міхаіл Зіновіч. На пытанне, колькі яшчэ будзе жыць Какорыца, ён адказаў:

— Гадоў пятнаццаць, не болей. Ужо ж палова хат пустымі стаяць. Раней у нас больш за сто дзяцей у школу хадзілі, а зараз восем чалавек у Бездзежскую школу возяць. Адны пенсіянеры застаюцца, гаспадарку няма каму ўжо трымаць. Рыбы ў Спораўскім возеры ў нас шмат, але ж не дазваляюць лавіць, штрафуюць. А пенсія ў мяне малая — 260 тысяч рублёў, бо я трынаццаць гадоў у Расіі на заробках быў, то працоўны стаж перарваўся…

Будынак магазіна ў Какорыцы на замку. Гандлёвую кропку (назваць магазінам яе цяжка) перанеслі ў будынак былой школы. Працуе тут Марыя Зіновіч, бібліятэкар, якую папрасілі выконваць па сумяшчальніцтву абавязкі прадаўца. Бібліятэка месціцца ў суседнім з магазінам пакоі, таму Марыя Зіновіч жартуе, што вяскоўцы прыходзяць сюды і за хлебам з пякарні, і за хлебам духоўным.

— Ідуць людзі нешта купіць у магазіне, а я іх заадно і ў бібліятэку завяду, — расказвае прадаўшчыца-бібліятэкар, — таму вяскоўцы нашыя чытаюць шмат.

З іншай сацыяльнай інфраструктуры ў Какорыцы маецца фельчарска-акушэрскі пункт, а таксама імправізаваны прыпынак (звычайная лавачка і вядро ля дрэва замест сметніцы), на які па выхадных прыязджае аўтобус з Драгічына, а таксама па буднях забірае какорыцкіх дзяцей школьны аўтобус з Бездзежа.




Какорыцкі “вузел паштовай сувязі”.



Уезд у вёску Какорыца абкружаны балотцамі.

Тут жа, на прыпынку, вісіць прама на дрэве паштовая скрынка для пісем.

— Вы з газеты? То напішыце, каб нам дарогу наладзілі, бо дрэнна выбірацца нам адсюль пры патрэбе, — папрасіла нас напрыканцы нашага візіту ў Какорыцу жанчына па прозвішчы Зіновіч, якая пешшу ішла з Бездзежа. — Зараз жа выбары будуць, то каб хоць цяпер просьбу нашу задаволілі…

Яна гаварыла гэта без абурэння, але і без упэўненасці ў тым, што гэтая просьба будзе пачута…

**Павел ДАЙЛІД.**
**Фота аўтара.**
**Драгічынскі раён.**

# Калі тэлевізар не “паказвае”,

## то пакупнік мае права на... суд

**На гэтым тыдні ва ўсіх краінах адзначаўся Сусветны дзень абароны правоў спажыўцоў. Наша рэспубліка практычна з першых дзён далучылася да адпаведнай канвенцыі, летась быў прыняты новы закон, які рэгулюе сферу ўзаемадзеяння прадаўца і пакупніка.**

**Між тым, нягледзячы на гэта, як паведамляе старшыня суда Пружанскага раёна Уладзімір Саўчук, колькасць канфліктаў, якія даводзіцца вырашаць у гэтай інстанцыі, штогод павялічваецца.**

— Кожны год даводзіцца разглядаць па некалькі дзесяткаў спраў,— расказвае Уладзімір Уладзіміравіч.— У асноўным спрэчкі тычацца складанай бытавой тэхнікі, што прымушае людзей звяртацца ў спецыяльныя ўстановы, якія маглі б даць заключэнні пра стан апаратуры. А летась пераважная колькасць спраў была звязана з абаронай спажыўцоў, якія заказалі ўстаноўку пластыкавых шклопакетаў. Тут былі прэтэнзіі не толькі да якасці вырабаў, але і да праведзенага мантажу.

**— Чым выкліканы такі рост скаргаў: павелічэннем пакупніцкай здольнасці нашых грамадзян або павелічэннем колькасці розных фірм, сярод якіх сустракаюцца несумленныя прадстаўнікі?**

— Прыкладна ў роўнай ступені гэтыя два фактары ўплываюць на сёлетнюю сітуацыю. Да фірм, сапраўды, шмат прэтэнзій. З-за прагнасці некаторыя бізнесмены набіраюць такую колькасць кліентаў, што не паспяваюць у вызначаны тэрмін задаволіць усе заяўкі. Большасць жа пакупнікоў за такія паслугі разлічваюцца крэдытнымі сродкамі, расход якіх строга кантралюе і патрабуе своечасовай справаздачы банк-крэдытор. Ёсць такія арганізацыі, што ў пагоні за кліентурай як мага хутчэй камплектуюць штаты сумніўным персаналам, у выніку чаго ўзнікаюць нараканні на якасць работ. Такія канфлікты часцей звязаны з “маладымі” фірмамі, прапановы якіх вылучаюцца скідкамі, рознымі падарункамі і акцыямі.

На маю думку, каб пазбегнуць рызыкі стаць героем сумнай гісторыі, трэба звяртацца да сталых і вядомых на адпаведным рынку паслуг кампаній, не трапляць на вуду “цікавых” прапаноў, а таксама мець справу з мясцовымі арганізацыямі.

**— Уладзімір Уладзіміравіч, ці даводзілася разглядаць справы, якія звязаны больш з махлярствам і падманам пакупнікоў?**

— Ні ў адным рашэнні суда па адпаведных спрэчках пакуль не гаварылася пра факт махлярства. Хаця апошняя справа, якая зараз разглядаецца, вельмі падобная на падман. Прадпрымальнік са Слуцка прапаноўваў пружанцам паслугі па рамонту мэблі. Збіраў заказы і браў за гэта перадаплату. Не ўсе заказы выкананы ў тэрмін, але пры гэтым узнікае думка: а ці была эканамічная мэтазгоднасць вазіць мяккія куткі з Камянца, Пружан, Івацэвічаў ажно ў Слуцк? На жаль, усе пацярпелыя не задаваліся такім пытаннем, іх больш прыцягвалі нізкія цэны на паслугі.

**— Здаецца, новы закон дае канчатковыя фармулёўкі і рэкамендацыі па “разрульванні” практычна ўсіх канфліктных сітуацый. Аднак усё роўна справы чамусьці даходзяць да суда.**

— Праблема ў тым, што няма практыкі дасудовай працэдуры па разгляду спрэчак. Як правіла, бакі не згаджаюцца ісці на пры-мірэнне. Пэўную ролю адыгрывае і той факт, што многія прадаўцы маюць нізкі ўзровень юрыдычнай адукаванасці. Хаця кожнаму трэба ведаць той факт, што пераважная большасць рашэнняў суда была на карысць спажыўца.

**— Уладзімір Уладзіміравіч, дайце параду, як дзейнічаць пакупніку, які апынуўся ў такой непрыемнай сітуацыі.**

— У першую чаргу трэба звяртацца ў камітэт па абароне правоў спажыўцоў. Там дапамогуць граматна скласці неабходны пакет дакументацыі, падчас судовага разгляду справы могуць прадставіць і свайго прадстаўніка для абароны інтарэсаў істца. Былі і такія выпадкі, калі камітэт звязваўся з гандлюючай арганізацыяй і пытанне вырашалася шляхам дасудовай працэдуры.

У якасці варыянту спажывец можа звярнуцца і па дапамогу да адвакатаў. Пры гэтым важна памятаць, што ўсе выдаткі, калі справа вырашаецца на карысць істца, будзе вымушана кампенсаваць гандлюючая арганізацыя або яе прадстаўнікі. Акрамя таго, істцы па закону вызваляюцца ад уплаты пошліны.

**Васіль СНАПКО.**
**г. Пружаны.**

# Сводка погоды (19.03.2010 г. — 25.03.2010 г.)

| от www.meteo.by | 19 | 19 | 20 | 20 | 21 | 21 | 22 | 22 | 23 | 23 | 24 | 24 | 25 | 25 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день |
| Температура, С | +2 | +5 | +4 | +5 | +4 | +8 | +8 | +9 | +5 | +10 | +4 | +1 | -2 | -2 |
| Тенденция давления | 744 | 743 | 740 | 741 | 742 | 738 | 735 | 739 | 743 | 745 | 740 | 741 | 741 | 742 |

УНН 200515456
Редакции
"Газеты для вас"
ТРЕБУЮТСЯ
РАСПРОСТРАНИТЕЛИ
в г. Дрогичин, Береза,
Пружаны.
Телефон для справок:
8-(01645) 2-48-87, 2-12-29.

ВСЕМ — СУПЕРРАССРОЧКА
до 12 месяцев без %
Даже без первоначального взноса
или ВСЕМ КРЕДИТ
без первоначального взноса
до 3-х лет
Без СПРАВОК И ПОРУЧИТЕЛЕЙ
• БЫТОВАЯ ТЕХНИКА
• КОМПЬЮТЕРЫ
• КОТЛЫ
• КОЛОНКИ
• ВОДОНАГРЕВАТЕЛИ
ТЦ "АллюрТорг"
г. Барановичи, ул. Чернышевского, 8
Тел. 8-(0163) 41-32-83
УНН 290500741 ООО "АллюрТорг"

Стальные двери
Окна и двери
из ПВХ и AL
Межкомнатные
двери
Большой выбор
Скидки, рассрочка.
*Расчет нал. и безнал.*
Тел. 8-029-772-56-39
8-029-372-56-39
8-029-524-89-53
WWW.mnenado.biz
ИП Шишова А. А. Сви д. № 0160870 от 17.12.2008 г. Берёзовским РИК.

ЛЕСТНИЦЫ
металлическое основание
Форма оплаты любая
Фото на сайте
www. irontrap.narod.ru
Изготовление
Т. 8-029-614-39-12, 8-033-621-66-86
ЧП "ЛеСтРоМ" УНП 590779129



Роллеты. Гаражные ворота.
- секционные
- поворотно-подъемные (р-ры стандартные)
Балконы раздвижные AL.
Тел. 8-(01643) 58-4-66, 8-029-723-48-04
Производство, монтаж, гарантия.
Свид. № 0117375 от 13.02.07. г. Березовским РИК. УНН 290730074

ВСЕМ
СУПЕРРАССРОЧКА
до 12 месяцев без %
Даже без первоначального взноса
• СОТОВЫЕ ТЕЛЕФОНЫ
• Ж/К ТЕЛЕВИЗОРЫ
• НОУТБУКИ
• ОКНА И ДВЕРИ ПВХ
или ВСЕМ КРЕДИТ
без первоначального взноса
до 3-х лет
Без СПРАВОК И ПОРУЧИТЕЛЕЙ
ТЦ "АллюрТорг"
г. Барановичи, ул. Чернышевского, 8
Тел. 8-(0163) 41-32-83
УНН 290500741 ООО "АллюрТорг"

## Вядзецца падпіска на "ГАЗЕТУ ДЛЯ ВАС" на II квартал 2010 г.

*Падпісацца на яе можна ў любым паштовым аддзяленні Івацэвіцкага раёна*

| | ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ (індэкс 63834) | ДЛЯ ВЕДАМАСНАЙ ПАДПІСКІ (індэкс 64145) |
|---|---|---|
| на 1 месяц | — 4840 рублёў | — 8715 рублёў |
| на квартал | — 14520 рублёў | — 26145 рублёў |
| на паўгоддзе | — 29040 рублёў | — 52290 рублёў |

### ПРАВИЛА ПОДАЧИ ЧАСТНЫХ ОБЪЯВЛЕНИЙ ПО КУПОНУ

- Купон предназначен для бесплатного частного объявления (детям (продаю и куплю), утеряно, даром, стол находок, ищу работу) или поздравления без стихотворного куплета и фотографии.
- За каждый стихотворный куплет к поздравлению нужно перечислить **1000 рублей на счет 3012000001022 ф-л 111 АСБ "Беларусбанк", г. Ивацевичи, код 150501623, УНН 200515456** и выслать квитанцию вместе с купоном и текстом на адрес отдела рекламы редакции: **г. Ивацевичи, ул. Ленина, 8а.** Эти же реквизиты используются для оплаты объявлений в платные рубрики.
- Один купон должен содержать **ОДНО** объявление в **ОДНУ** рубрику.
- При заполнении каждая буква или цифра пишется в одну клеточку, между словами пропускается по одной клетке.
- Купоны без фамилии и адреса рекламодателя, а также коммерческого характера не печатаются.

**ПЛАТНЫЕ РУБРИКИ** (одно слово — 400 руб.)

**продается** (недвижимость; авто-мото-вело, запчасти, сельхозмашины; бытовая и оргтехника; мебель; разное)
**куплю, сниму, сдам, меняю, требуется;**

**минимальная стоимость 2800 руб.; оплата производится и в отделе рекламы редакции: г. Ивацевичи, ул. Ленина, 8А.**

### ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС — КУПОН
для частного объявления в бесплатные рубрики

**ДЕЙСТВИТЕЛЕН с 19.03.10г. по 25.03.10г.**

**Текст писать разборчиво, печатными буквами**

Фамилия, имя и адрес
(сведения не печатаются): ____________

**БЕСПЛАТНЫЕ РУБРИКИ:**
детям (продается и куплю);
утеряно, даром, стол находок, ищу работу.

## ГОРОСКОП
**22.03—28.03**

**ОВЕН (21.3—20.4)**
Больше внимания уделите романтике в существующих личных отношениях. В этот период не исключены конфликты, но при этом вы сможете объективно понять имеющиеся сложности в ваших взаимоотношениях. В течение второй половины этой недели вам будет очень важно избегать проявлений эгоизма. Опасайтесь деспотизма, применения силы, старайтесь не проявлять жестокость.

**ТЕЛЕЦ (21.4—20.5)**
Внимательнее относитесь к состоянию собственного здоровья. Удача будет сопутствовать в бытовых делах: сейчас любые вопросы по хозяйству вы сможете решать очень успешно. Не стоит доверять случайным людям в течение второй половины этой недели. В этот период вы просто будете притягивать людей с иными убеждениями, которые могут навязывать вам свою точку зрения или свое мировоззрение.

**БЛИЗНЕЦЫ (21.5—21.6)**
Первая половина этой недели окажется не самым удачным периодом для общения и развлечений вместе со своими друзьями. Вероятны новые контакты во время прогулок, поездок, в небольших кафе или в общественном транспорте. В течение второй половины этой недели стоит избегать любого риска — неверные решения сейчас могут иметь более серьезные последствия, чем вы можете себе представить.

**РАК (22.6—22.7)**
Вы можете почувствовать, что некоторые традиции, а порой даже условности могут мешать вам реализовывать собственные амбиции. Однако это не то время, когда стоит идти вперед и внедрять какие-либо инновации в свою жизнь. Более традиционные подходы, упорство и следование принятым нормам поведения сейчас окажутся наиболее эффективным способом.

**ЛЕВ (23.7—23.8)**
Расположение планет в течение первой половины этой недели не будет способствовать вашим успехам в обучении. Скорее, напротив, прошлые долги, невыполненные задания и не полученные в свое время знания могут дать о себе знать в виде различных событий. Во второй половине этой недели не стоит заниматься работой, которую вы не слишком хорошо знаете.

**ДЕВА (24.8—23.9)**
На первую половину этой недели не стоит планировать решение вопросов, связанных с кредитами, долгами и инвестициями. Все расчеты сейчас стоит проводить наличными, и не забывайте о том, что не стоит афишировать свои доходы. Повышенная склонность к азарту будет свойственна в течение второй половины этой недели. Сейчас вы можете идти на необдуманный риск, а делать этого не стоит.

**ВЕСЫ (24.9—23.10)**
Не стоит проявлять излишнюю холодность и прагматизм как в личных, так и в деловых отношениях. Первая половина этой недели также может принести вам новые планы и идеи, активизировать ваше взаимодействие с друзьями, соратниками и единомышленниками. В течение второй половины этой недели не участвуйте в конфликтах между родственниками.

**СКОРПИОН (24.10—22.11)**
Внимательнее относитесь к своему здоровью. Не стоит сейчас открыто обсуждать свои истинные цели, лучше держать их при себе. Составление распорядка дня может стать важной деталью вашей жизни в течение второй половины этой недели. Все дело в том, что без четкого распорядка вы можете погрязнуть в суете и мелких проблемах, в мелочах просто забыть о главном.

**СТРЕЛЕЦ (23.11—21.12)**
Ваши друзья сейчас могут не одобрять те поступки, которые вы совершаете в своих личных взаимоотношениях. Вероятно, что им сейчас просто не нужно знать некоторых деталей вашей личной жизни. Сократите свои расходы на развлечения. Это вовсе не означает, что от развлечений и увеселений стоит отказаться, нужно лишь выбрать не самые дорогостоящие удовольствия.

**КОЗЕРОГ (22.12 — 20.1)**
Вы можете заметить, что далеко не всегда традиционные методы решения задач приводят к успешным результатам. Пугаться не стоит — вы не стали неудачником, просто в течение этого периода необходимо внести некоторые новые элементы в свою жизненную структуру, быть может, изменить приоритеты. Это время подходит для смелых и решительных поступков, обдуманных перемен в вашей жизни.

**ВОДОЛЕЙ (21.1 — 19.2)**
В общении сейчас будут появляться недоразумения, а само общение может происходить несколько более напряженно и натянуто, чем обычно. Сейчас вы можете вполне рассчитывать на понимание со стороны близкого человека. Во второй половине этой недели не стоит доверять никакой непроверенной информации. Вас могут ввести в заблуждение, причем как случайно, так и специально.

**РЫБЫ (20.2—20.3)**
Не лучшее время для совершения покупок, особенно крупных, решения вопросов, связанных с получением или отсрочкой выплат по кредиту. Усилия лучше направить на выполнение своей работы, повышение производительности вашего труда, решения сложных задач. Неплохим станет это время и для интенсивного лечения или профилактики заболеваний.



ИП Шишов В. А. Свид. № 0160870 от 17.12.2008 г. Березовским РИК. УНН 290736442
лимузин
8-029-772-56-39 8-029-721-21-81
WWW.MNENADO.BIZ

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ЛІДЗІЯ ВАСІЛЬЕЎНА ЦАЛУЙКА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС
Набіраецца ў Івацэвічах, друкуецца ў філіяле №1 ААТ "Чырвоная зорка" (225409, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80). ЛП № 02330/0494160 ад 30.04.2004 г. Аб'ём — 4 друк. аркушы. Падпісана да друку 18 сакавіка ў 14.00. Заказ 781.

"Газета для вас" выдаецца са студзеня 1997 г. Заснавальнік: УП "Газета для вас". Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі РБ. Пасведчанне № 423 ад 22 мая 2009 г.

Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў. Іх меркаванні могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі.
Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных аб'яў.
(R) — матэрыял друкуецца на правах рэкламы.
Спасылка на нашу газету абавязковая.

Падпісныя індэксы:
63834 (індывідуальная)
64145 (ведамасная)
Кошт:
у індывідуальных гандляроў — свабодны.
Тыраж 3.000 экз.

АДРАС РЭДАКЦЫІ "Газеты для вас":
вул. Леніна, 8А, г. Івацэвічы, 225295
Тэлефоны: (8-01645) 2-12-29 (гал. рэдактар),
(8-01645) 2-48-87 (факс, карэспандэнты, рэклама),
Карпункт у Бярозе — 8-029-332-94-57.
E-mail:gdv@promedia.by
http://www.gdv.of.by